# Раздзел I. ТЭАРЭТЫЧНЫЯ І ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЫТАННІ РАЗВІЦЦЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ І КНІЖНАЙ СПРАВЫ БЕЛАРУСІ

***Кузьмініч Таццяна Васільеўна***
Нацыянальная бібліятэка Беларусі

## АСНОЎНЫЯ КІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК БЕЛАРУСІ З НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ДАКУМЕНТАМ І ІХ НАРМАТЫЎНАЕ ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ

Беларускія нацыянальныя дакументы адносяцца да тых сродкаў культурнай ідэнтыфікацыі нацыі, якія забяспечваюць паўнавартаснае ўключэнне нашай краіны ў сусветную інфармацыйную прастору і яе эфектыўны ўдзел у міжкультурных камунікацыях. Гэта частка сусветнага дакументнага патоку, які «ўзнік і разгортваецца да сённяшняга часу як унікальнае адлюстраванне разумовага, творчага працэса зямной цывілізацыі, як яе інтэлектуальная гісторыя» [1]. Яна спрыяе захаванню сацыяльнай памяці беларускага грамадства, фарміраванню нацыянальнага складніка інфармацыйнай базы айчыннай навукі, адукацыі, вытворчасці, а таксама прамоцыі беларускай дакументнай спадчыны на міжнародным узроўні. Функцыянаванне нацыянальных дакументаў абумоўлівае дзейнасць шэрага сацыяльных інстытутаў, намаганні якіх скіраваны на стварэнне, назапашванне, перапрацоўку і выкарыстанне шырокага спектра фіксаванай інфармацыі. Тут важную ролю адыгрываюць бібліятэкі [2], у сферу кампетэнцый якіх уваходзіць збор асноўнага блоку агульна даступных легітымна створаных інфармацыйных рэсурсаў, а таксама інфармацыйнае абслугоўванне самай шырокай чытацкай аўдыторыі. Іх намаганнямі фарміруецца сукупны бібліятэчны фонд нацыянальных дакументаў (СБФ

НД) – фіксаванай агульнадаступнай інфармацыі, якая па тэрытарыяльнай, моўнай, аўтарскай і змястоўнай прыметах адносіцца да Беларусі [3].

Функцыянаванне СБФ НД можна разглядаць на трох узроўнях: рэспубліканскім ці нацыянальным (фонды нацыянальных дакументаў нацыянальнай і рэспубліканскіх бібліятэк краіны, якія атрымліваюць абавязковы экзэмпляр дакументаў і набываюць (атрымліваюць у дар) нацыянальныя дакументы для інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання і папаўнення рэтраспектыўнай часткі фонда), рэгіянальным (мэтанакіравана фарміруемыя фонды (часткі фондаў) дакументаў, створаных на тэрыторыі канкрэтнага рэгіёну (вобласці, раёна, горада і інш.), прысвечаных гэтаму рэгіёну) і лакальным (сукупнасць нацыянальных дакументаў, прадстаўленых у фондзе канкрэтнай бібліятэкі для задавальнення інфармацыйных патрэб пэўных катэгорый карыстальнікаў у адпаведнасці з задачамі бібліятэкі). Пры гэтым рэалізуюцца розныя падыходы да паўнаты калекцыі і тэрмінаў захавання дакументаў: 1) максімальна поўны збор нацыянальных дакументаў і іх пастаяннае захаванне (характэрна для нацыянальнага і рэгіянальнага ўзроўняў); 2) камплектаванне дакументамі (па меры неабходнасці) ў адпаведнасці з патрэбнасцямі карыстальнікаў і часовае захоўванне асобнікаў у залежнасці ад перыяда старэння інфармацыі (характэрна для лакальнага ўзроўню). Відавая структура СБФ НД адлюстроўвае ўсю шматграннасць нацыянальных дакументных патокаў з улікам магчымасцей выкарыстання носьбітаў інфармацыі і арганізацыі доступу да іх.

Нацыянальны ўзровень канцэнтрацыі СБФ НД павінен забяспечваць паўнату рэтраспектыўнай і бягучай частак нацыянальнага дакументнага патоку (кніг, газет, часопісаў, дысертацый, аўтарэфератаў дысертацый, нот, карт, выяўленчых выданняў і іншых відаў дакументаў і іх электронных копій), якія захоўваюцца ў бібліятэках, цалкам адлюстроўвацца ў нацыянальных пошукавых сістэмах, такіх як электронны інфармацыйны рэсурс «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі», Зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі, Нацыянальная база даных аўтарытэтных запісаў, а ў перспектыве – Нацыянальнай электроннай бібліятэцы Беларусі. Да таго ж неабходна яго інтэграцыя на метаінфармацыйным

узроўні з сукупнасцю нацыянальных дакументаў, якая фарміруецца іншымі сацыяльнымі інстытутамі інфармацыйнай інфраструктуры краіны (Нацыянальнай кніжнай палатай Беларусі, Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі (НЦПІ), Беларускім інстытутам сістэмнага аналізу (БелІСА) і інш.).

Рэгіянальны ўзровень канцэнтрацыі нацыянальных дакументаў прадугледжвае забеспячэнне паўнаты рэтраспектыўнай і бягучай частак нацыянальнага дакументнага патоку, створаных на тэрыторыі канкрэтнага рэгіёну (вобласці, раёна, горада і інш.), адлюстраванне рэгіянальнай часткі СБФ НД у рэгіянальных і нацыянальных пошукавых сістэмах, а таксама магчымасць метаінфармацыйнага ўзаемадзеяння з рэгіянальнымі і нацыянальнымі блокамі рэсурсаў, ствараемых вышэйназванымі сацыяльнымі інстытутамі інфармацыйнай інфраструктуры краіны.

Лакальны ўзровень канцэнтрацыі нацыянальных дакументаў уяўляе сабой нейкі аптымальны масіў айчынных дакументаў, які ў спалучэнні з іншымі інфармацыйнымі рэсурсамі забяспечвае паўнавартаснае задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей розных катэгорый чытачоў у адпаведнасці з задачамі, зместам працы канкрэтнай бібліятэкі, а таксама адлюстраванне лакальнай часткі СБФ НД ў лакальных, рэгіянальных і нацыянальных пошукавых сістэмах.

У гэтым артыкуле будзе засяроджана ўвага ў асноўным на функцыянаванні нацыянальнага ці рэспубліканскага ўзроўню СБФ НД – яго самай аб’ёмнай часткі. Яго фарміраванне забяспечваецца ў межах дзейнаці НББ і рэспубліканскіх бібліятэк, якія з’яўляюцца атрымальнікамі абавязковых экзэмпляраў: поўнага камплекта – НББ, Прэзідэнцкая бібліятэка, ЦНБ НАН Беларусі; галіновых камплектаў – РНТБ, РНМБ, БелСГБ НАН Беларусі. Рэгіянальны ўзровень забяспечваюць абласныя бібліятэкі Беларусі, якія па заканадаўчых нормах атрымліваюць неперыядычныя і перыядычныя выданні, электронныя і камбінаваныя выданні, выпускаемыя арганізацыямі адпаведнай вобласці. На лакальным узроўні нацыянальныя дакументы прадстаўлены ў любых іншых бібліятэчных установах краіны ў аб’ёме і рэпертуары, неабходных для іх бягучай работы.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі ўзначальвае сістэму бібліятэк краіны і займае лідзіруючыя пазіцыі ў развіцці сукупнага

бібліятэчнага інфармацыйнага рэсурсу і нацыянальнага дакумента як яго неад’емнай часткі. Яна мае найбольш поўны у свеце збор беларускіх нацыянальных дакументаў і адну з самых багатых у краіне калекцый замежных дакументаў. Нацыянальныя дакументы з’яўляюцца аб’ектам асобай увагі, нягледзячы на тое, што ад асноўных (ці дзеючых) фондаў НББ яны складаюць менш за 10% (за выключэннем газетнага фонду, у якім нацыянальны сегмент складае больш паловы ад агульнай колькасці камплектаў). Нацыянальныя дакументы з’яўляюцца таксама асноўным аб’ектам фарміравання фонду міжнароднага дакументаабмену НББ. Ён аператыўна абнаўляецца, дазваляе атрымліваць на парытэтнай аснове цікавыя для беларускіх чытачоў замежныя дакументы і спрыяе прамоцыі беларускай нацыянальнай дакументнай спадчыны ў сусветную інфармацыйную прастору, развіццю міжнароднага бібліятэчнага супрацоўніцтва. Нацыянальныя дакументы з’яўляюцца асноўным складнікам страхавых (рэзервных) фондаў НББ. Гэта, як правіла, дублетныя экзэмпляры дакументаў, прызначаныя для ўзнаўлення (па меры неабходнасці) дэфектаваных, зношаных, страчаных дакументаў з асноўнага фонда, копіі дакументаў на мікра- і іншых носьбітах. Масівы нацыянальных дакументаў трапляюць і ў фонд унутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў, які функцыянуе пры НББ. Ён прызначаны для выкарыстання айчыннымі бібліятэкамі, інфармацыйнымі цэнтрамі, уключае дакументы, якія паступілі на бязвыплатнай аснове, з’яўляюцца празмерна дублетнымі і няпрофільнымі ў адносінах да асноўных фондаў НББ. Аналіз работы бібліятэк Беларусі з нацыянальным дакументам паказвае, што на практыцы могуць быць рэалізаваны розныя алгарытмы фарміравання СБФ НД: розныя віды нацыянальных дакументаў могуць быць вылучаны ў самастойныя дакументныя масівы (з улікам месца захоўвання наяўных асобнікаў) – фонды, падфонды, калекцыі; нацыянальныя дакументы могуць быць уключаны ў склад краязнаўчых, храналагічных, моўных і іншых фондаў, калекцый бібліятэкі.

Для якаснага фарміравання СБФ НД і любых яго складнікаў неабходна добра сфарміраваная заканадаўчая база і надзейныя механізмы яе прымянення [4]. На працягу апошняга дзесяцігоддзя ў нашай краіне адбыліся істотныя змены ў нарматыўнай прававой базе, якая рэгламентуе асноўныя кірункі дзейнасці як НББ, так

і іншых бібліятэк, у тым ліку і з нацыянальным дакументам. Гэта прыняцце ў 2016 г. Кодэкса аб культуры Рэспублікі Беларусь (раней – змены ў Закон «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь») і скасаванне раней прынятых дакументаў, такіх як Інструкцыя па ўліку і захаванасці бібліятэчных фондаў у Рэспубліцы Беларусь (2002), Інструкцыя аб парадку ажыццяўлення ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў; прыняцце Закона «Аб выдавецкай справе ў Рэспубліцы Беларусь» (2012) і новага Палажэння аб абавязковым бясплатным экзэмпляры дакументаў, зацверджанага Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 03.09.2008 г. № 1284. Абнаўляліся таксама лакальныя нарматыўныя дакументы: статуты асобных бібліятэк, профілі камплектавання, палажэнні аб фондах (падфондах, калекцыях), была распрацавана Інструкцыя па ўліку і захаванасці фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (2008) і інш.

У названых дакументах у дачыненні да нацыянальнага дакумента найбольш выразна вызначаны паўнамоцтвы і адказнасць Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У прыватнасці, у Кодэксе аб культуры Рэспублікі Беларусь адзначана, што яна «фарміруе, зберагае, пастаянна захоўвае і прадстаўляе карыстальнікам бібліятэкі найбольш поўны збор айчынных дакументаў і беларусікі…», «арганізуе доступ да нацыянальных … баз даных» (арт. 138), «фарміруе і вядзе Дзяржаўны рэестр кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь» (арт. 142) [5].

Палажэнне аб абавязковым бясплатным экзэмпляры [6] распаўсюджваецца на шырокі спектр друкаў, лакальныя электронныя, камбінаваныя выданні, неапублікаваныя і патэнтныя айчынныя дакументы. Яно на дзяржаўным узроўні вызначае мэты сістэмы абавязковага экзэмпляра адпаведна міжнародным патрабаванням, усталёўвае правы і абавязкі яго вытворцаў, атрымальнікаў і карыстальнікаў. На сённяшні дзень сістэма беларускага абавязковага экзэмпляра па-свойму ўнікальная (71 атрымальнік, з іх 14 бібліятэк, шэраг органаў дзяржаўнага кіравання, а таксама архівы, праваахоўныя і судовыя органы і інш.) [7]. Але ў сувязі з гэтым непазбежна павялічваюцца выдаткі выдаўцоў і вытворцаў, павышаецца сабекошт выдання, што ўплывае на павелічэнне выпуску малатыражных выданняў і з’яўляецца адным са стымулаў развіцця выданняў у «безтыражным» фармаце «друк па патрабаванні».

Бібліятэкі, якія маюць гарантаваную магчымасць атрымання бясплатнага і поўнага камплекта нацыянальных дакументаў (бібліятэкі-атрымальнікі), абавязаны выконваць па адносінах да іх мемарыяльную функцыю. Яны, згодна з Палажэннем, нясуць адказнасць за камплектаванне поўнага фонду дакументаў, выробленых на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь або за яе межамі рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, як часткі сусветнага культурнай спадчыны. У абавязкі бібліятэк-атрымальнікаў уваходзяць не толькі камплектаванне фондаў абавязковымі экзэмплярамі дакументаў, але і ажыццяўленне іх рэгістрацыі і бібліяграфічнага ўліку з адлюстраваннем звестак аб іх у розных крыніцах бібліяграфічнай інфармацыі, а таксама забеспячэнне іх пастаяннага захоўвання.

Асобна агавораны абавязкі ў адносінах да нацыянальных дакументаў Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі, НББ і РНТБ. У прыватнасці, НББ «адлюстроўвае звесткі аб абавязковым экзэмпляры ў інфармацыйна-пошукавых сістэмах і падае іх у грамадскае карыстанне», а таксама «прымае абавязковы экзэмпляр у абменны фонд ад дзяржаўных органаў, якія з'яўляюцца атрымальнікамі абавязковых асобнікаў паводле часткі другой пункта 19 гэтага Палажэння», гэта значыць «пасля ажыццяўлення функцый кантролю і страты актуальнасці абавязковага асобніка ў бягучай дзейнасці» дзяржаўных органаў. За РНТБ замацавана адказнасць за камплектаванне фонду выданняў па інтэлектуальнай уласнасці, у тым ліку патэнтных дакументаў Рэспублікі Беларусь, іх пастаяннае захоўванне і адлюстраванне звестак аб іх у даведачна-пошукавых сістэмах.

Бачыцца мэтазгоднай аптымізацыя структуры атрымальнікаў абавязковага экзэмпляра, істотнае скарачэнне іх колькасці, распаўсюджванне абавязковых экзэмпляраў толькі па тых установах, якія здзяйсняюць поўны цыкл прац з дакументам як фактам гісторыка-культурнага працэса (атрыманне, рэгістрацыя і пастаяннае захаванне ўсіх адзінак камплекта незалежна ад зместа дакумента, яго мэтавага і карыстальніцкага прызначэння) і за якімі замацавана мемарыяльная функцыя як адна з асноўных, прычым для тыражыруемых дакументаў (напрыклад, у архіўных установ, якія таксама ўключаны ў пералік атрымальнікаў бясплатнага абавязковага экзэмпляра друкаў, свой блок адказнасці за нетыражыруемыя дакументы).

З пачатку XXI ст. айчынныя даследчыкі і практыкі звярталі ўвагу на неабходнасць уключэння электронных інфармацыйных рэсурсаў (з рознымі варыянтамі набора) у пералік абавязковага экзэмпляра, якія рэгіструюцца дзяржавай і належаць абавязковай рассылцы па асобных арганізацыях [8]. Але толькі ў 2008 г. да абавязковага экзэмпляру былі аднесены камбінаваныя выданні, а таксама электронныя выданні, ствараемыя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Па-за межамі нацыянальнага ўліку і захавання да сённяшняга дня застаецца вялікі блок электронных інфармацыйных рэсурсаў (базы даных, сайты, парталы, электронныя варыянты друкаваных выданняў, электронныя онлайнавыя выданні, айчынныя рэсурсы адкрытага доступу). Застаецца нявырашаным пытанне аб крытэрыях адбору сеткавых і іншых электронных рэсурсаў, замацаванне адпаведных паўнамоцтваў за той ці іншай установай, магчымаці іх інтэграцыі ў сфарміраваную сістэму адлюстравання нацыянальных дакументаў. Фарміраванне калекцыі нацыянальных электронных дакументаў на падставе комплекса прымет (тэрыторыя, мова, аўтарства, змест) вельмі праблематычна і па сутнасці магчыма толькі ў дачыненні да электронных выданняў. У дачыненні да онлайнавых дакументаў магчыма даволі паслядоўна вытрымаць толькі тэрытарыяльную прымету.

Разам з тым электронныя рэсурсы могуць збірацца і па-за сістэмай абавязковага экзэмпляра. Рэгістрацыя і архіваванне сеткавага нацыянальнага кантэнту можа рабіцца рознымі ўдзельнікамі (кніжнай палатай, бібліятэкамі, выдаўцамі, інфармацыйнымі цэнтрамі і інш.) у межах асобнага праекта (праектаў), рэалізацыя якога магчыма на аснове дзяржаўнай зацікаўленасці і надзейнага інстытуцыянальнага партнёрства [9].

Бібліятэчнай супольнасцю нашай краіны шырока выкарыстоўваюцца магчымасці лічбавага асяроддзя як па арганізацыі доступу да онлайнавых рэсурсаў, так і па стварэнні і збіранні электронных копій розных відаў дакументаў з мэтай захавання іх арыгіналаў, набліжэння да карыстальніка вялікіх аб’ёмаў інфармацыі ў зручнай форме, запаўнення прабелаў у нацыянальнай дакументнай спадчыне лічбавымі копіямі дакументаў і да т. п. Пры гэтым НББ і іншыя бібліятэкі нашай краіны асвоілі самыя розныя алгарытмы ўзаемадзеяння як у сваім прафесійным асярод-

дзі [10], так і са знешнімі партнёрамі. Некаторыя з алгарытмаў атрымалі нарматыўнае рэгуляванне.

З 2005 г. па дамоўленасці з Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй НББ прыступіла да фарміравання электроннай калекцыі аўтарэфератаў дысертацый, абароненых на тэрыторыі Беларусі. Пры гэтым НББ здзяйсняе алічбоўку рэтраспектыўнай часткі масіву (у хуткім часе работа будзе завершана), а бягучы паток электронных варыянтаў аўтарэфератаў дысертацый капіруе з сайта камісіі. Электронныя копіі дысертацый пасля абароны згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (ад 24 жніўня 2006 г. № 516) «О внесении изменений и дополнений в Положение о присуждении ученых степеней и присвоении ученых званий в Республике Беларусь» у абавязковым парадку накіроўваюцца ў НББ. На жаль, да гэтага часу застаецца нявырашаным пытанне аб рэтраспектыўнай частцы масіву беларускіх дысертацый. Не поўнасцю алічбаваны масіў рукапісаў дысертацый, якія захоўваюцца ў НББ (амаль 8 тыс. экзэмпляраў, атрыманых у НББ пасля 1995 г. і да канца 2006 г.). Неабходны таксама вялікія намаганні для атрымання электронных копій (заказ на стварэнне лічбавых копій у выпадку іх адсутнасці) беларускіх дысертацый, прадстаўленых у Электроннай бібліятэцы дысертацый РДБ, магчыма заключэнне дамоў з ўстановамі, у якіх праходзіла абарона дысертацый, заключэнне адпаведных пагадненняў з іх аўтарамі. Застаецца актуальным вырашэнне шэрага стратэгічных пытанняў па фарміраванні нацыянальнай калекцыі дысертацый, у прыватнасці крытэрыяў адбору, выяўленне дысертацый, створаных беларускімі вучонымі, на беларускім матэрыяле, якія былі абаронены за межамі Беларусі, і да т. п.

З пачатку 2007 г. НББ фарміруе масіў электронных копій нацыянальных перыядычных выданняў. На сучасным этапе больш за 450 найменняў газет, часопісаў, матэрыялаў інфармацыйных агентстваў (па дамовах з рэдакцыямі) аператыўна паступае ў НББ і адлюстроўваецца ў базе даных «Электронны архіў нацыянальнай перыёдыкі», лакальным электронным каталозе; рэтраспектыўная частка лічбуецца ў планавым рэжыме. Неабходна пашырэнне рэпертуару да выключнай паўнаты (найбольш поўна адлюстроўваюцца толькі навуковыя часопісы), больш актыўная праца НББ па алічбоўцы рэтрамасіву і пошуку электронных копій дакумен-

таў, якія адсутнічаюць у фондасховішчах НББ і іншых бібліятэчных установу краіны, а таксама вырашэнне пытання аб уключэнні тых перыёдыкаў, якія існуюць толькі ў электронным асяроддзі.

Нягледзячы на значныя дасягненні бібліятэк у зборы асобных блокаў электронных інфармацыйных рэсурсаў [11] і стварэнне ўстойлівых алгарытмаў іх папаўнення, неабходна аптымізацыя нарматыўна-рэгламентуючай базы, найперш вышэйназванага Палажэння аб абавязковым бясплатным экзэмпляры дакументаў, у кірунку пашырэння іх асартымента за кошт электронных копій друкаў, электронных онлайнавых выданняў, рэпазіторыяў і баз даных. Неабходна таксама распрацоўка і нарматыўнае рэгуляванне (у лакальных дакументах) падыходаў да вызначэння інфармацыйнай, культурнай, гістарычнай значнасці «самаробных» электронных дакументаў, якія не падпадаюць пад абавязковую рассылку, а па змястоўнай, тэрытарыяльнай і аўтарскай прыметах падпадаюць пад катэгорыю нацыянальных дакументаў.

Перспектыўным бачыцца адлюстраванне нацыянальнага лічбавага кантэнту як на ідэнтыфікацыйным узроўні, так і яго архіваванне. Неабходна пашырэнне ўдзелу нашай краіны ў сістэмах міжнароднай стандартнай нумарацыі, у прыватнасці серыяльных выданняў (ISSN) і лічбавых публікацый, аб'ём якіх павялічваецца з кожным годам і не павінен знаходзіцца па-за ўвагай нацыянальных бібліяграфуючых цэнтраў, а таксама рэалізацыя захадаў па прамоцыі аўтарытэтных і бібліяграфічных запісаў на айчынную дакументную прадукцыю ў адпаведных міжнародных рэсурсах.

Усе вышэйназваныя прапановы па ўдасканаленні нарматыўнай прававой базы функцыянавання нацыянальных дакументаў тычацца рэгіянальнага і лакальнага ўзроўняў канцэнтрацыі СБФ НД. Але бачыцца надзвычай актуальным распрацоўка асобных матэрыялаў інструктыўнага характару па працы з рэгіянальнымі (краязнаўчымі) дакументамі (Палажэнне аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Рэспублікі Беларусь [12] было адменена, як і некаторыя вышэйназваныя нарматыўныя дакументы).

На наш погляд, удасканаленне нарматыўнай прававой базы, якая тычыцца працы бібліятэк з нацыянальнымі дакументамі, з'явіцца найлепшым стымулам для акцэнтавання ўвагі нашай прафесійна супольнасці менавіта на гэтым сегменце інфармацыйна-рэсурснай базы, актывізацыі намаганняў па зборы нацыянальн-

най дакументнай прадукцыі і стварэнні інфармацыйных рэсурсаў краіназнаўчага і краязнаўчага характару. А гэта, у сваю чаргу, дазволіць замацаваць за бібліятэкамі збор, захаванне і разнастайную інфармацыйную апрацоўку нацыянальных фіксаваных тэкстаў, а таксама сусветных патокаў інфармацыі, якія маюць дачыненне да айчыны, яе пэўнага рэгіёна, тэрыторыі, нацыі, народа і дасць магчымасць рабіць свой выключна важны ўнёсак у справу захавання гісторыка-культурнай памяці грамадства.

ЛІТАРАТУРА

1. **Гордукалова, Г. Ф.** Документальный поток – национальное достояние / Г. Ф. Гордукалова // Национальная библиотека. – 2014. – № 3. – С. 20.

2. **Васильченко, Н. П.** Принципы формирования библиотечных фондов / Н. П. Васильченко // Научные и технические библиотеки. – 2006. – № 7. – С. 22.

3. **Лявончыкаў, В. Е.** Нацыянальны дакумент: падыходы да вызначэння зместу і аб'ёму паняцця / Лявончыкаў В. Е. // Нацыянальны дакумент як аб'ект дзейнасці бібліятэк Беларусі : зб. арт. / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; [склад. Т. В. Кузьмініч ; рэдкал.: Л. Г. Кірухіна і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 11–21.

4. **Ковальчук, Г.** Діяльність бібліотек зі збереження національноЇ спадщини: проблеми кооперацiЇ / Г. Ковальчук // Бібліотечна планета. – 2010. – № 3. – С. 11.

5. **Кодэкс** Рэспублікі Беларусь аб культуры : Кодэкс Рэсп. Беларусь, 20 ліпеня 2016 г., № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобраны Саветам Рэсп. Беларусь 30 чэрв. 2016 г. // Эталон – Беларусь [Электронны рэсурс] / Нац. цэнтр прававой інфармац. Рэсп. Беларусь. – Мінск, 2017. – Дата доступа: 04.12.2017.

6. **Положение** об обязательном бесплатном экземпляре документов : утверждено пост. Совета Министров Республики Беларусь от 3 сент. 2008 г. № 1284.

7. **Кузьмініч, Т. В.** Нацыянальная бібліяграфія і захаванне кніжнай спадчыны Беларусі / Т. В. Кузьмініч, А. В. Іванова // Матэрыялы міжнар. кангрэса «500 гадоў беларускага кнігадрукавання» : у 2 ч. Ч. 1. XIII Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні, Мінск, 14–15 верасня 2017 г. / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; [складальнік А. А. Суша]. – Мінск, 2017. – С. 15–28.

8. **Ермолич, Е. И.** Государственная библиографическая информация Беларуси в электронной среде / Е. И. Ермолич // Библиография. –

2007. – № 2. – С. 42–47 ; **Иванова, Е. В.** Национальная библиография Беларуси в международном контексте / Е. В. Иванова // Библиография. – 2005. – № 4. – С. 17–26.

9. **Кузьмініч, Т. В.** Нацыянальная бібліяграфія …

10. **Кузьмініч, Т. В.** Нацыянальны электронны дакумент як аб'ект дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі / Т. В. Кузьмініч // Нацыянальны дакумент як аб'ект дзейнасці бібліятэк Беларусі : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. В. Кузьмініч ; рэдкал.: Л. Г. Кірухіна [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 52–61 ; Цифровые коллекции Национальной библиотеки Беларуси как основа формирования контента Национальной библиотеки Беларуси / Т. В. Кузьминич [и др.] // Бібліятэчны веснік : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі ; рэдкал.: Р. С. Матульскі (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – Вып. 3 / склад.: Л. Г. Кірухіна, М. Г. Пшыбытка ; рэд.: Л. Г. Кірухіна (гал. рэд.), В. А. Сабалеўская, Ж. К. Зяневіч. – С. 151–159.

11. **Бричковский, В. И.** Электронные периодические издания как стратегический путь развития научных коммуникаций / В. И. Бричковский // Развитие информатизации и государственной системы научно-технической информации : РИНИТИ-2015 : XIV Международная конференция, 19 ноября 2015 года, Минск : доклады / [научные редакторы: А. В. Тузиков, Р. Б. Григянец, В. Н. Венгеров]. – Минск, 2015. – С. 307–308 ; **Кузьмініч, Т. В.** Нацыянальны электронны дакумент … С. 52–61.

12. **Палажэнне** аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Рэспублікі Беларусь : пастанова М-ва культуры Рэсп. Беларусь, 28 снеж. 1993 г. : зарэгістр. 6 снеж. 1999 г., № 8/1931. – [Мінск, 1993]. – Неапубл. дак. – Архіў Нац. б-кі Беларусі, 1993.

*Представлены уровни формирования совокупного фонда национальных документов библиотек Беларуси, а также апробированные алгоритмы поступления различных электронных документов в Национальную библиотеку Беларуси. Анализируется правовое обеспечение этого направления деятельности библиотек. Вне правового регламентирования остаются направления работы, связанные с электронными информационными ресурсами.*

*The levels of formation of the aggregate fund of national documents of Belarusian libraries are presented, as well as approved algorithms for the receipt of various electronic documents in the National Library of Belarus. Legal support of this area of activity of libraries is analyzed. The areas of work, related to electronic information resources, are staying outside of legal regulation.*